УДК 821.161.3

# РЕПРЕЗЕНТАЦИЯ НАЦИОНАЛЬНЫХ КУЛЬТУРНЫХ КОДОВ В РОМАНЕ К. ЦВИРКИ «ВОЛЧИЙ ОСТРОВ»

*Л. Г. ДУКТОВА*[1)]

[1)]*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь*

Национальные культурные коды имеют художественное воплощение в образах и мотивах произведения, выступают своеобразными катализаторами проявления авторской позиции и формирования определенных взглядов читателей на темы, затронутые в романе К. Цвирки «Волчий остров». Через определение культурных смыслов внутри диад *хороший – плохой*, *правильно – дурно*, *мужское – женское*, *история – вечность* и *свой – чужой* показываются отношение героев к семье, родине, труду, а также связи человека и общества. Делается вывод о том, что в романе К. Цвирки «Волчий остров» использование пространственного, временного и персонажного кодов направлено на отображение чувств к родной земле, а обращение к акциональному коду помогает очертить специфику деревенской жизни белоруса, акцентировать внимание на его трудолюбии. При изображении судьбы Игнасия Королени перечисляются особенности отношения жителей Беларуси к родине, семье и своему дому.

***Ключевые слова:*** культурный код; национальный образ мира; роман; культурный смысл; пространственный код; временной код.

# РЭПРЭЗЕНТАЦЫЯ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ КУЛЬТУРНЫХ КОДАЎ У РАМАНЕ К. ЦВІРКІ «ВОЎЧАЯ ВЫСПА»

*Л. Г. ДУКТАВА*[1*]

[1*]*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь*

Нацыянальныя культурныя коды маюць мастацкае ўвасабленне ў вобразах і матывах твора, выступаюць своеасаблівымі каталізатарамі праяўлення аўтарскай пазіцыі і фарміравання пэўных поглядаў чытачоў на тэмы, закранутыя ў рамане К. Цвіркі «Воўчая выспа». Праз вызначэнне культурных сэнсаў у межах дыяд *добры – дрэнны*, *правільна – кепска*, *мужчынскае – жаночае*, *гісторыя – вечнасць* і *свой – чужы* паказваюцца стаўленне герояў да сям'і, радзімы, працы, а таксама сувязі чалавека і грамадства. Робіцца вывад аб тым, што ў рамане К. Цвіркі «Воўчая выспа» выкарыстанне прасторавага, часавага і персанажнага кодаў скіравана на паказ пачуццяў да роднай зямлі, а звяртанне да акцыянальнага кода дапамагае акрэсліць спецыфіку вясковага жыцця беларуса, акцэнтаваць увагу на яго працавітасці. Пры адлюстраванні лёсу Ігнася Каралені пералічваюцца асаблівасці стаўлення жыхароў Беларусі да айчыны, сям'і і свайго дому.

***Ключавыя словы:*** культурны код; нацыянальны вобраз свету; раман; культурны сэнс; прасторавы код; часавы код.

**Образец цитирования:**
Дуктава ЛГ. Рэпрэзентацыя нацыянальных культурных кодаў у рамане К. Цвіркі «Воўчая выспа». *Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Філалогія.*2023;3:21–27.
EDN: JLDEJR

**For citation:**
Duktava LG. Representation of national cultural codes in K. Cvirka's novel «Wolf island». *Journal of the Belarusian State University. Philology.* 2023;3:21–27. Belarusian.
EDN: JLDEJR

**Автор:**
***Любовь Георгиевна Дуктова*** – кандидат филологических наук, доцент; доцент кафедры технологий коммуникации и связей с общественностью факультета журналистики.

**Author:**
***Liubou G. Duktava***, PhD (philology), docent; associate professor at the department of communication technologies and public relations, faculty of journalism.
*docent2020@yandex.ru*
*https://orcid.org/0009-0003-5401-7932*

CC BY NC

# REPRESENTATION OF NATIONAL CULTURAL CODES IN K. CVIRKA'S NOVEL «WOLF ISLAND»

*L. G. DUKTAVA*[a]

[a]*Belarusian State University, 4 Niezaliezhnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus*

National cultural codes have an artistic embodiment in the images, motifs of the work, act as a kind of catalysts for showing the author's position and forming certain views of the readers on the topics covered in K. Cvirka's novel «Wolf island». Through the definition of cultural meanings within the dyads *good – bad*, *right – wrong*, *masculine – feminine*, *history – eternity*, and *own – foreign*, the work shows the relationship to the family, homeland, work, connection between man and society. It was concluded that in K. Cvirka's novel «Wolf island», the spatial, temporal and personal codes are aimed at showing relations to native land, the action code helps to outline the specifics of the village life of a Belarusian, his hard work. When portraying the fate of Ignas Karalenja, the features of the attitude of residents living on Belarusian land to the motherland, family and their home are shown.

***Keywords:*** cultural code; national image of the world; novel; cultural meaning; spatial code; time code.

## Уводзіны

Нацыянальныя культурныя коды з'яўляюцца носьбітамі гісторыка-культурных сэнсаў, яны звязаны з сацыяльнымі, эканамічнымі, геапалітычнымі і культурнымі асаблівасцямі прадстаўнікоў пэўнай нацыі ў прыватнасці або нават насельніцтва дзяржавы ў цэлым. У сучасным гуманітарным дыскурсе код разглядаецца ў дачыненні да тэрмінаў «код культуры» [1, с. 39; 2, с. 5; 3, с. 28–29; 4, с. 3; 5, с. 8–10], «лінгвакультурны код» [6–8], «канцэптуальны код» [9, с. 333–337; 10] і «нацыянальны культурны код» [11; 12].

Літаратуразнаўчы аналіз па вызначэнні адметных рыс рэпрэзентацыі культурных кодаў у канве мастацкага твора грунтуецца на семіятычным падыходзе, скіраваным на акрэсленне спецыфікі нацыянальнай карціны свету. Даследаванню культурных кодаў у літаратуры прысвечаны дысертацыі Т. У. Болдыравай [13], М. Ю. Жылінай [14], Л. У. Калугінай [15], Я. А. Кулікова [16], А. М. Мельнікавай [17], А. А. Раманава [18], А. Г. Трубяцковай [19] і інш.

Вызначэнне і апісанне культурных кодаў у літаратурным творы ажыццяўляюцца з дапамогай інтэрпрэтацыйнага аналізу тэксту, іх тыпалагічнага супастаўлення з кодамі іншых культур, а таксама праз канцэптуальнае мадэляванне. С. М. Талстая прапанавала адрозніваць у тэксце наступныя віды культурных кодаў: канцэптуальныя коды, у аснове якіх ляжыць ментальная сутнасць (прадстаўленні, матывы, паняцці), і змястоўныя коды [3]. Да ліку апошніх адносяцца лічбавы, прадметны, прасторавы, часавы, саматычны, раслінны, анімалістычны і іншыя коды. Пры разглядзе сістэмы культурных кодаў можна вылучыць некалькі модуляў, у прыватнасці модуль жыццядзейнасці чалавека (акцыянальны (код дзеянняў), саматычны, марбуальны, гастранамічны і духоўны коды), модуль чалавека і прыроды (анімалістычны, раслінны і метэаралагічны коды), модуль чалавека і грамадства (персанажны код), а таксама модуль чалавека і свету (касмаграфічны, прасторавы, часавы, лікавы, каляровы, астранамічны, атрыбутыўны і прадметны коды).

К. Цвірка прысвяціў працы над раманам «Воўчая выспа» дзесяць гадоў (2008–2018). У артыкуле «Раман Кастуся Цвіркі варты школьнай праграмы» Л. В. Дранько-Майсюк высока ацаніў гэты эпічны твор: «Скажу так: раман "Воўчая выспа" запоўніў нішу, якая да нядаўняга часу была пустой. Паміж трагедыйнай напружанасцю прозы Васіля Быкава, сямейнай мазаікай мініяцюр Янкі Брыля, шляхетным духам Віктара Карамазава, філасофскай эстэтыкай Віктара Казько і нацыянальнымі пошукамі Генрыха Далідовіча – для мяне як чытача заставаўся прагон, нейкая незанятая прастора. Вось з гэтай прасторы і з'явіўся раман Кастуся Цвіркі, які і трагедыйны, і сямейны, і шляхетны, і філасофскі, і нацыянальны, а перш за ўсё неверагодна чуллівы… да людзей, жыцця, прыроды, радзімы, сялянскай працы» [20, с. 636]. Даследчык звяртае ўвагу на рысы прыгодніцкага твора, якія акрэсліваюць жанравыя асаблівасці рамана К. Цвіркі і адзначае, што «жыццё Ігнася праходзіла на Воўчай выспе, можна сказаць паводле рамантычных законаў, усё адно як у прыгодніцкай літаратуры» [20, с. 638]. У сваю чаргу, Л. М. Галубовіч вылучыў прыкметы фэнтэзі і прыгодніцкага рамана ў тэксце: «Фармальна гэта абсалютна самабытны твор нацыянальнай літаратуры, які па-цяперашняму можна аднесці да жанру фэнтэзі (альбо прыгодніцкага рамана), накладзенага на рэалістычны фон арыгінальнага мастацкага выяўлення» [21, с. 305]. Нарэшце, Г. В. Навасельцава знайшла ў ім адметныя рысы рамана-эсэ: «"Воўчая выспа" рэпрэзентуе жанравыя паказчыкі рамана-эсэ: змястоўная глыбіня, сэнсавая шматграннасць увасоблены ў трансфармаванай мастацкай форме» [22, с. 377].

Выкарыстанне прасторавага, часавага, акцыянальнага, анімалістычнага і іншых культурных кодаў пры адлюстраванні рэчаіснасці дазваляе пісьменніку трапна данесці да рэцыпіента пэўныя ідэі, паказаць асаблівасці нацыянальнага характару, спецыфіку ладу жыцця і светасузірання: «Беларус, паляшук, селянін – зусім не казачны асілак, аднак жа волат духу!» [20, с. 635]. Мэта дадзенага артыкула – вызначэнне адметных рыс рэпрэзентацыі нацыянальных культурных кодаў у рамане К. Цвіркі «Воўчая выспа».

## Вынікі і іх абмеркаванне

Раман К. Цвіркі «Воўчая выспа» прысвечаны паказу лёсу чалавека падчас правядзення палітыкі раскулачвання. Тэма трагедыі сям'і ў перыяд сталінскай калектывізацыі не з'яўляецца новай для беларускай літаратуры, пра што сведчыць шэраг эпічных твораў (аповесці Васіля Быкава «Аблава», Янкі Сіпакова «Кулак»). Сімвалічная назва рамана звязана з неабходнасцю адлюстравання жыцця ў лясной нерушы пасярод балот – на Воўчай выспе, таму небеспадстаўна асобныя эпізоды ў творы змяшчаюць элементы традыцый, закладзеных у аповесці Якуба Коласа «Дрыгва», рамане Івана Мележа «Людзі на балоце». Лёс чалавека, адасобленага ад грамадства, нагадвае воўчае жыццё – матыў, які прысутнічае ў творчасці беларускіх аўтараў (аповесці Васіля Быкава «Аблава», Алеся Наварыча «Цкаванне вялікага звера» і інш.), а таксама ў сусветнай літаратуры (раманы Г. Гесэ «Стэпавы воўк», В. Пелевіна «Свяшчэнная кніга пярэваратня» і інш.).

Герой рамана – беларускі селянін. Яшчэ ў дзяцінстве і маладосці ён сфарміраваў і захаваў у свядомасці такія каштоўнасці, як сям'я, адданасць працы на зямлі, павага да людзей навокал, каханне і радзіма. Падчас правядзення палітыкі раскулачвання разам з роднымі мужчына быў адпраўлены ў Сібір, адкуль наперакор лёсу вярнуўся дадому, але не мог жыць пад адным дахам з жонкай і сынам, бо меў кляймо кулака. Адзінае выйсце, якое знайшоў Ігнась Караленя, – пасяліцца на Воўчай выспе, у месцы, да якога цяжка дабрацца звычайнаму чалавеку. Дзякуючы кемлівасці, працавітасці ён менш чым за год здолеў стварыць у глушы свой аазіс. Ігнась збудаваў дом, наладзіў гаспадарку, прыручыўшы жывёл, і нават узараў у нерушы ўласнае поле: «Будаўніцтва паглынула яго з галавой. Кожнай раніцай ледзьве прачынаўся, як ужо бег на сваю будоўлю. Не вылазіў адтуль дацямна. Адлучаўся толькі, каб згатаваць якую яду і прагнаць голад.

Акуратненька выбіраў-выдзёўбваў сякерай чашкі вуглоў, роўна ўсцілаў вянкі зруба мохам, які загатовіў загадзя, шчыльна ўкладваў паверх новыя бярвёны» [20, с. 103]; «Коз жа на Воўчай выспе – процьма.

З іх і пачне абзаводзіцца тут сваёй жывёлай, з дзікай рабіць свойскую» [20, с. 185]; «Высеяную пшанічку Ігнась акуратненька забаранаваў граблямі. Тыя зярняты, што астатнія наверсе, утаптаў у зямлю пяткаю нагі – каб дарэмна не прапала ні каліва. Невялічкі лапік выйшаў у яго пшаніцы. Але для пачатку і гэта добра» [20, с. 184].

У творы прысутнічаюць замалёўкі вясковага пейзажу, сцэны апісання быту селяніна. Разам з тым у рамане паказана, што, калі чалавек апынаецца сам-насам на новым месцы, яго дзеянні скіроўваюцца на аднаўленне звычайнага быту, парадку, асноў жыцця. Мае рацыю Л. В. Драньько-Майсюк: «Раман Кастуся Цвіркі можна назваць падручнікам жыцця: кніга вучыць, як выжыць у невыносных умовах; кніга нагадвае: тады, калі людзі не ведалі хлеба, бручка ды рэпа замянялі хлеб; з рамана можна даведацца, як закладваць сад і адваёўваць у лесу поле; як дагледзець збажыну і займацца паляваннем; як здабыць кляновік і бярозавік і завесці пчальніковую гаспадарку; як адкляпаць і асадзіць касу перад касавіцай і з чаго зрабіць мянташку; як святкаваць Каляды і калі пачынаць засеўкі; як дзікіх коз зрабіць свойскімі і як прывучыць лясного каня (тарпана) да хамута і сахі…» [20, с. 638].

З дапамогай акцыянальнага кода К. Цвірка паказвае справы, якімі займаецца гаспадар і якія спрадвеку з'яўляюцца традыцыйнымі для вясковага жыхара (касьба, малацьба, праца на раллі, будоўля дому, догляд свойскіх жывёл, рыбалоўства, паляванне). Праз гастранамічны код падкрэсліваецца шчодрасць беларускай зямлі: для руплівага чалавека, які апынуўся сам-насам з прыродай у лясной глушы, няма перашкоды здаволіць голад ці нават накрыць шчодры стол. Сцэны, у якіх апавядаецца пра святкаванне Калядаў на Воўчай выспе, змяшчаюць апісанне святочных страў: «Яшчэ завідна, да ўсходу сонца, прынёс у хату жменю пахкага мурожнага сена, палажыў на стол, накрыў сурвэткай і паставіў на яго сваю куццю ў гліняным місцы. А вакол куцці прымасціў скавародку з смажанай рыбай, міску вывараных грыбоў і на чыстай дошчачцы паклаў кучку сухіх уюноў. Паставіў у конаўцы і ўзвар з ігрушак-дзічак, падсаладжаных малінамі. Абвёў усё вачыма – чым не святочны стол? Нават традыцыі не парушыў: пяць (якраз няцотны лік) належных для гэтага выпадка страў на ім выстраілася» [20, с. 170–171]. Выкарыстанне гастранамічнага кода ў літаратурных творах спалучана з апісаннем страў, якія ўвасабляюць нацыянальную спецыфіку і рысы гістарычнага часу, характарызуюць гасціннасць, беражлівасць ці іншыя чалавечыя якасці. На думку В. А. Ляшчынскай, «ва ўсіх сусветных культурах вобразы ежы, яе ўжыванне

напаўняюцца культурна-сімвалічным зместам – набываюць абрадавы, рытуальны, міфалагічны, сакральны сэнс, атрымліваюць асаблівае аксіялагічнае значэнне» [23, с. 10].

Звяртанне да духоўнага кода звязана з пастаноўкай маральна-этычных пытанняў. У рамане паказаны падзеі, у якіх героі паўстаюць перад выбарам. Дыяда *правільна – кепска* праяўляецца пры аналізе паводзін многіх персанажаў твора. Дзеянні службовых асоб падчас сталінскіх часоў ацэньваюцца з двух бакоў – негатыўнага і пазітыўнага. Не выдаў Ігнася Караленю і захаваў яму свабоду міліцыянер Лёня Яцэвіч па мянушцы Трэба, які шукаў яго на гарышчы, а ўбачыўшы, зрабіў выгляд, што нікога не заўважыў: «Во асвяціў Ігнасевы босыя ногі (не паспеў абуцца), пайшоў па правай калашыне штаноў, па фрэнчы і суняўся на твары, яго правым баку – пачаў гладзіць шчаку, нос, вуха. Ігнась не варушыцца, глядзіць прама на шчыт з вакенцам, і вока не паварочвае ў бок міліцыянера. <…>

Трэбу нібы зарвала нешта. Ён памаўчаў з хвіліну і ўжо нейкім прыкметна пацвярдзелым голасам сказаў:

– Не! Няма нікога! Пуста тут!

Ігнась, які ўжо наважыўся брацца за сякеру, вушам сваім не паверыў: гэты ж Трэба бачыць яго як міленькага!» [20, с. 49–50].

Прадстаўнік улады з вобласці дапамог Хрысціне Каралені ўладкавацца на працу: «Выслухаўшы Хрысціну, якая ўсё перад ім выклала, упаўнаважаны, паўнаваты, ужо сталы чалавек, крутнуўся на крэсле, павярнуўся да калгасных верхаводаў: “Вы што, звяры?” Прысаромленыя начальнікі адразу прынялі яе ў калгас» [20, с. 32].

Зрухі ў дыядзе *свой – чужы* паказаны ў дачыненні да ацэнкі ўчынкаў, партрэтных характарыстык персанажаў рамана. Бацька Ігнася Каралені да раскулачвання карыстаўся заслужанай павагай у вёсцы Воля, бо быў працавітым гаспадаром, меў конную малатарню, якую эксплуатавала ўсё наваколле. Але час перакрыжаваў усе заслугі мужчыны. З-за заможнай гаспадаркі ён быў прызнаны кулаком і высланы ў Сібір, дзе загінуў разам са сваёй сям’ёй. Выжыў толькі яго сын Ігнась.

Для паказу трагічнасці лёсу чалавека, ідэй супрацьстаяння выклікам грамадства і выпрабавання адзіноцтвам выкарыстоўваецца анімалістычны код, у адпаведнасці з якім у творы прысутнічаюць паралелі паміж жыццём чалавека-ізгоя і ваўка. Воўчая выспа – гэта прыродная неруш, месцазнаходжанне якой недасягальна для людзей, таямніца, што захоўваў род Караленяў, апошні прытулак для Ігнася. Сэнсавая формула «чалавек – воўк», прымянімая ў адносінах да чалавека-ізгоя, злачынца (быццам драпежніка), мае глыбокія карані. Яна занатавана ў законах хетаў, стражытнагерманскіх юрыдычных тэкстах, работах Платона. Комплекс «чалавек – воўк» вывучаўся З. Фрэйдам і яго паслядоўнікамі. Ігнась Караленя не адчувае небяспекі ад ваўкоў, але хаваецца ад людзей: «З ваўкамі ён сустракаўся тут часцяком. Убачыўшы іх, Ігнась не ўцякаў ад іх і не адпужваў ад сябе. Рабіў выгляд, што яны яго не абыходзяць. Ваўкі таксама ім не цікавіліся. Пры сустрэчы ішлі сваёй дарогай, не затрымліваючы на ім вачэй. Між імі і Ігнасем устанавілася поўнае мірнае суіснаванне» [20, с. 113].

Яшчэ адну паралель паміж чалавекам і воўкам у рамане можна прасачыць праз лёс аднаго з сыноў Ігнася Каралені. Янка быў выхаваны воўчай зграяй і нават стаў яе правадыром. У Хрысціны і Ігнася Караленяў нарадзіліся блізняты Стасік і Янка. Калі аднойчы жонка ўзяла іх з сабой на працу і пакінула каля краю поля, аднаго з хлопчыкаў схапілі ваўкі. Лёс сына быў невядомы да таго часу, пакуль Ігнась не пасяліўся на Воўчай выспе, дзе адшукаў і пачаў выхоўваць Янку, спадзяваючыся на тое, што ўрэшце сям’я аб’яднаецца: «Абышоўшы поле, ён вярнуўся дадому.

Янка ўжо ўспароўся. <…> Калі ўвайшоў бацька, падбег пад яго: быў, значыцца, ужо яму рады. А гэта ж, можна сказаць, немалы зрух. Ігнась узяў хлопчыка на рукі, прытуліў да сябе, стараючыся, як і кожны раз, распрамляць яго падкручаныя ножкі, якімі сын так і торкаўся ў бацькаў жывот. Панасіў, ласкаючы, па хаце і паставіў у хадунок – бегай, родны, вучыся, выпроствайся» [20, с. 163].

Пра тое, што сын жывы, Хрысціна дазналася толькі з лістоў памерлага мужа.

З дапамогай персанажнага кода ў рамане паказаны зрухі ў дыядах *добры – дрэнны*, *мужчынскае – жаночае*. Асаблівасці і пэўныя рысы характару беларускай жанчыны адлюстраваны ў вобразе Хрысціны Каралені (ахвярнасць, бяскрыўднасць і спадзяванне на светлы зыход у бядзе). Сцэна, у якой Хрысціна, адчуваючы скорае няшчасце, просіць забраць яе з сабой на Воўчую выспу, напоўнена сумам і безвыхаднасцю. Але Ігнась вырашае спачатку пабудаваць дом, наладзіць гаспадарку, а ўжо потым забраць з сабою жонку і дзіця. Шчымлівыя адносіны да любай жанчыны праяўляюцца ў лістах Ігнася з Воўчай выспы. Пяшчотай і любасцю напоўнены радкі, у якіх ён звяртаецца да яе: «Мая родная, мая залатая Хрысцінка! Пішу табе з нашай новай сядзібы, з нашай хаты, якую я збудаваў на бязлюднай Воўчай выспе, пасярод непраходных балот і дзе мы скора будзем жыць. <…> Слухай жа, слухай, мая любая Хрысцінка: знайшоўся наш сын Янка! Чуеш ты гэта ці не, Хрысцінка?!» [20, с. 137]; «Ведаю, Хрысцінка, як табе не церпіцца даведацца пра мае пошукі» [20, с. 139]; «Я не ўтаміў цябе, Хрысцінка, сваімі доўгімі пісьмамі?» [20, с. 144]; «Хрысцінка, спяшаю падзяліцца з табой радасцю: Янка даўся сябе абняць!» [20, с. 159].

Такі кампазіцыйны элемент, як увядзенне ў тэкст прыватных лістоў, садзейнічае паказу ўнутранай барацьбы асобы паміж верай ў лепшую будучыню, якая дае сілы пераадольваць перашкоды, і ўсведамленнем няўмольнасці абставін, што правакуюць на выбар паміж жыццём і незламаным духам. Г. В. Навасельцава адзначае, што «…эсэістычны аповед дазваляе кантрасна супаставіць звярыную лютасць і чалавечыя ўчынкі, якія тым цяжэй асэнсаваць, паколькі немажліва знайсці нешта міласэрнае. Трагічны фінал рамана абумоўлены тым, што на Воўчую выспу ўсё ж прыходзяць людзі» [22, с. 376].

К. Цвірка ў межах дыяды *гісторыя – вечнасць* падкрэслівае канстанты нацыянальнага характару: ахвяроўваць сабой, але захоўваць годнасць; не спадзявацца на іншага і шмат працаваць, каб мець дабрабыт; нягледзячы на шэраг перашкод, верыць у лепшую будучыню. Твор завяршаецца трагічна: галоўны герой выбірае скончыць жыццё і кідаецца ў водную бездань, але не дае зламаць сябе маральна. На думку Л. В. Дранько-Майсюка, «чалавек гіне, бо захаваць сваё жыццё магчымасці няма ніякай, аднак жа ён захоўвае годнасць і нескароную душу!» [20, с. 635].

У рамане паказаны тры перыяды жыцця Ігнася Каралені: да раскулачвання, на чужыне і на Воўчай выспе. Шчаслівая пара прыйшлася на першы перыяд, калі маленства і маладосць Ігнася праходзілі ў звычайнай сялянскай сям'і. Яна памятная з-за вясковай працы пад доглядам і навучаннем бацькі, начных размоў з аднагодкамі каля вогнішча падчас выпасу коней, а таксама дзякуючы першаму каханню, спатканням на досвітку, вяселлю і нараджэнню дзіцяці. Другі перыяд, які атаясамліваецца з ад'ездам на чужыну, успрымаўся Ігнасем Караленяй як часовае становішча, з якім нельга змірыцца. Дыяда *свой – чужы* звязана с сітуацыяй, калі герой паўстае перад выбарам: дапамагчы чужой сям'і або шукаць сваю. Ён часова падтрымлівае людзей, якія апынуліся ў цяжкіх абставінах, але потым вырашае шукаць сваіх родных з бацькоўскай сям'і. Як аказалася, яны загінулі. Трэці перыяд звязаны з жыццём на Воўчай выспе, надзеяй вярнуць страчанае шчасце. У рамане гучыць ідэя аднаўлення, якая натхняе на працоўны і духоўны подзвіг.

Выкарыстанне часавага кода спалучана з семіятызацыяй адрэзкаў часу з жыцця чалавека, святаў народнага календара, пор года. Звяртанне да прасторавага кода звязана з адлюстраваннем вобразаў вёскі, горада, хаты, млына, леса, балота, поля і найперш роднай зямлі: «Калі бацька быў на вайне, Ігнась, яшчэ падлетак, сам гаспадарыў на сваёй зямлі, сам араў, баранаваў і сеяў. І рабіў усё ў пару. Нават з нецярпеннем чакаў, калі яна настане, тая жаданая пара – любіў гэтую работу» [20, с. 39]. У шэрагу мастацкіх твораў беларускай літаратуры прысутнічае матыў роднай зямлі. Згадаем урывак з паэмы Якуба Коласа «Новая зямля», у якім паказаны адносіны да яе як да падмурку жыцця: *Купіць зямлю, прыдбаць свой кут,* / *Каб з панскіх выпутацца пут,* / *І там зажыць сабе нанова:* / *Свая зямля – вось што аснова!* [24, с. 67]. У рамане К. Цвіркі «Воўчая выспа» пералічаны многія пакуты, якія неабходна выцерпець дзеля набыцця ўласнай зямлі, а значыць, незалежнасці і дабрабыту: «Хто не ведае, што значыць для селяніна зямля? Яна – аснова асноў яго, яго быту, яго дастатку. За яе селянін ішоў на вайну, рабіў рэвалюцыі. Каб прыдбаць шматок зямлі, ён, бывала, цягам усяго часу, галадаючы, адмаўляючы сабе ў самых пільных патрэбах, збіраў-запашваў грошы» [20, с. 66]. Тая ж думка прасочваецца і ў паэме Якуба Коласа «Новая зямля»: *Зямля не зменіць і не здрадзіць,* / *Зямля паможа і дарадзіць,* / *Зямля дасць волі, дасць і сілы,* / *Зямля паслужыць да магілы,* / *Зямля дзяцей тваіх не кіне,* / *Зямля – аснова ўсёй айчыне* [24, с. 265]. Мае рацыю А. М. Мельнікава: «Зямля – цэнтр беларускага вобраза свету, што адлюстравана нашай літаратурай» [17, с. 99].

## Заключэнне

Мастацкая літаратура транслюе сацыяльныя і духоўныя каштоўнасці, нацыянальны светапогляд і адлюстроўвае ідэйныя ўстаноўкі і стэрэатыпы, пры гэтым яна фарміруе грамадскую думку. Выкарыстанне культурных кодаў звязана з працэсам кадзіравання і дэкадзіравання інфармацыі, што дазваляе пры мінімальнай эксплікацыі сэнсавых апазіцый дамагчыся вызначанага эфекту ўздзеяння на рэцыпіента. Імпліцытнасць праяўляецца ў рэлевантнасці вобразаў і матываў мастацкага твора элементам карціны свету, назапашаным у памяці чытача.

У рамане К. Цвіркі «Воўчая выспа» выкарыстанне прасторавага, часавага і персанажнага кодаў скіравана на паказ гаспадарлівых адносін да сваёй зямлі і адлюстраванне культурных сэнсаў у межах дыяд *свой – чужы*, *гісторыя – вечнасць*, *правільна – кепска*. Звяртанне да акцыянальнага кода акрэслівае спецыфіку вясковага жыцця беларуса, робіць акцэнт на яго працавітасці. Будоўля хаты, праца на раллі, вядзенне гаспадаркі, догляд свойскіх жывёл, выраб прадметаў быту, прыгатаванне ежы – асноўныя дзеянні, з дапамогай якіх у творы паказаны мадэлі паводзін, ментальныя ўстаноўкі, характэрныя для нацыянальнага светаадчування.

Пры адлюстраванні лёсу Ігнася Каралені пералічаны асаблівасці адносін жыхароў Беларусі да айчыны, сям'і і свайго дому. Якія б знешнія перашкоды ні пагражалі краіне, ні руйнавалі яе спадчыну і дасягненні, прага да жыцця, аднаўлення і высакародны дух, які занатаваны ў нацыянальным характары, здольны захаваць уласную годнасць народа, даць новыя парасткі жыцця, не дазволіць страціць надзею на лепшую будучыню.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Барт Р. *Избранные работы. Семиотика. Поэтика*. Косикова ГК, редактор и составитель. Москва: Прогресс; 1989. 615 с. Совместно с издательством «Универс».

2. Красных ВВ. Коды и эталоны культуры (приглашение к разговору). *Язык, сознание, коммуникация*. 2001;19:5–19.

3. Толстая СМ. К понятию культурных кодов. В: Вахтин НБ, Левинтон ГА, редакторы. *АБ-60. Сборник статей к 60-летию А. К. Байбулина*. Санкт-Петербург: Издательство Европейского университета в Санкт-Петербурге; 2007. с. 23–31. (Серия «Studia Ethnologica»).

4. Маслова ВА, Пименова МВ. *Коды лингвокультуры*. Москва: Флинта; 2016. 180 с. Совместно с издательством «Наука».

5. Рапай К. *Культурный код: как мы живем, что покупаем и почему*. Саламатова У, переводчик. Москва: Юнайтед пресс; 2010. 167 с. (Серия «Сколково»).

6. Мартынов ВС. *Символика лингвокультурных кодов в составе англоязычного художественного текста* [диссертация]. Москва: Московский государственный институт международный отношений; 2009. 199 с.

7. Савицкий ВМ. Лингвокультурные коды: к обоснованию понятия. *Вестник Московского государственного областного университета. Серия: Лингвистика*. 2016;2:55–62. DOI: 10.18384/2310-712X-2016-2-55-62.

8. Эргешбай КМ. Лингвокультурный код как ключ к пониманию национальных образов. *Вестник Кыргызско-Российского славянского университета*. 2022;22(2):90–95. DOI: 10.36979/1694-500X-2022-22-2-90-95.

9. Толстая СМ. *Коды культуры и культурные концепты. Пространство слова. Лексическая семантика в общеславянской перспективе*. Москва: Индрик; 2008. 527 с.

10. Швед ИА, Ковалевич МС. О структурно-типологическом описании концептуальных кодов мифопоэтического мышления белорусов. *Вучоныя запіскі Брэсцкага ўніверсітэта. Частка 1, Гуманітарныя і грамадскія навукі*. 2014;10:154–164.

11. Гончаров ВВ. Влияние процессов глобализации на слом национального культурного кода: социально-философский анализ. В: Гончаров ВВ, редактор. *Глобальный конституционализм и перспективы мирового развития. Материалы II Международной научно-практической конференции (симпозиума) № МК-2; 11 сентября 2020 г.; Краснодар, Россия*. Москва: Спутник+; 2021. с. 174–183.

12. Рацибурская ЛВ, Шарыпина ТА. Актуальные проблемы изучения западноевропейской и русской ментальности (по итогам всероссийской научной конференции «Национальные коды в языке и литературе, особенности концептосферы национальной культуры»). *Российский гуманитарный журнал*. 2015;4(1):22–33. DOI: 10.15643/libartrus-2015.1.4.

13. Болдырева ТВ. *Типология культурных кодов в драматургии Л. Н. Андреева* [диссертация]. Самара: Самарский государственный педагогический университет; 2008. 186 с.

14. Жилина МЮ. *Метасюжет судьбы лирического героя в поэзии С. А. Есенина: основные культурно-художественные коды и мотивные комплексы* [диссертация]. Омск: Омский государственный университет имени Ф. М. Достоевского; 2006. 211 с.

15. Калугина ЛВ. *Поэзия Владимира Высоцкого и западноевропейская литература Средневековья и Возрождения: взаимодействие дискурсов и культурных кодов* [диссертация]. Омск: Омский государственный университет имени Ф. М. Достоевского; 2014. 153 с.

16. Куликов ЕА. *Национальные и культурные коды в романах Дэна Симмонса* [диссертация]. Нижний Новгород: Национальный исследовательский Нижегородский государственный университет имени Н. И. Лобачевского; 2018. 203 с.

17. Мельнікава АМ. *Канцэптуалізацыя нацыянальнага ў беларускай прозе першай трэці XX стагоддзя* [дысертацыя]. Гомель: Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны; 2017. 237 с.

18. Романов АА. *Культурные коды в лирике Е. Шварц* [диссертация]. Саратов: Саратовский национальный исследовательский государственный университет имени Н. Г. Чернышевского; 2021. 217 с.

19. Трубецкова ЕГ. *Морбуальный код русской литературы XX–XXI вв.* [диссертация]. Саратов: Саратовский национальный исследовательский государственный университет имени Н. Г. Чернышевского; 2022. 477 с.

20. Цвірка К. *Воўчая выспа*. Мінск: Харвест; 2019. 640 с.

21. Галубовіч ЛМ. Ад Марціна Кухты да Кастуся Цвіркі. Да 80-годдзя паэта, пісьменніка і выдаўца. *Дзеяслоў*. 2014;2:302–307.

22. Навасельцава ГВ. Раман-эсэ Кастуся Цвіркі «Воўчая выспа» ў кантэксце сучаснай беларускай літаратуры. У: Адамян ТМ, рэдактар. *Віцебскі край. Матэрыялы VI Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай 75-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне; 19 лістапада 2020 г.; Віцебск, Беларусь. Том 6.* Мінск: Нацыянальная бібліятэка Беларусі; 2021. с. 373–377.

23. Ляшчынская ВА. *Гастранамічны код культуры беларусаў. Стэрэатыпы ежы ў вобразах фразеалагізмаў беларускай мовы*. Мінск: Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы; 2022. 271 с.

24. Колас Я. *Новая зямля*. Мінск: Мастацкая літаратура; 2007. 333 с.

## References

1. Barthes R. *Izbrannye raboty. Semiotika. Poetika* [Selected works. Semiotics. Poetics]. Kosikova GK, editor and compiler. Moscow: Progress; 1989. 615 p. Russian. Co-published by the «Univers».

2. Krasnykh VV. [Codes and standards of culture (an invitation to talk)]. *Yazyk, soznanie, kommunikatsiya*. 2001;19:5–19. Russian.

3. Tolstaya SM. [On the concept of cultural codes]. In: Vakhtin NB, Levinton GA, editors. *AB-60. Sbornik statei k 60-letiyu A. K. Baibulina* [AB-60. Collection of articles dedicated to the 60th anniversary of A. K. Baibulin]. Saint Petersburg: Izdatel'stvo Evropeiskogo universiteta v Sankt-Peterburge; 2007. p. 23–31. (Series «Studia Ethnologica»). Russian.

4. Maslova VA, Pimenova MV. *Kody lingvokul'tury* [Linguistic culture codes]. Moscow: Flinta; 2016. 180 p. Russian. Co-published by the «Nauka».

5. Rapaille C. *Kul'turnyi kod: kak my zhivem, chto pokupaem i pochemu* [Cultural code. How we live, what we buy and why]. Salamatova U, translator. Moscow: Yunaited press; 2010. 167 p. (Series «Skolkovo»). Russian.

6. Martynov VS. *Simvolika lingvokul'turnykh kodov v sostave angloyazychnogo khudozhestvennogo teksta* [Symbolism of linguo-cultural codes in the composition of the English literary text] [dissertation]. Moscow: Moscow State Institute of International Relations; 2009. 199 p. Russian.

7. Savitsky VM. The concept of linguocultural codes: a rationale the theoretical substantiation of the concept of linguocultural codes. *Bulletin of Moscow Region State University. Series: Linguistics*. 2016;2:55–62. Russian. DOI: 10.18384/2310-712X-2016-2-55-62.

8. Ergeshbai KM. Linguocultural code as a key to understanding national images. *Vestnik of the Kyrgyz Russian Slavic University*. 2022;22(2):90–95. Russian. DOI: 10.36979/1694-500X-2022-22-2-90-95.

9. Tolstaya SM. *Kody kul'tury i kul'turnye kontsepty. Prostranstvo slova. Leksicheskaya semantika v obshcheslavyanskoi perspektive* [Culture codes and cultural concepts. Word space. Lexical semantics in the common Slavic perspective]. Moscow: Indrik; 2008. 527 p. Russian.

10. Shved IA, Kovalevicz MS. About structural-typological description of the conceptual codes of Belarusians mythopoetic thinking. *Scientific Proceeding of Brest University. Part 1, The Humanities and Social Sciences*. 2014;10:154–164. Russian.

11. Goncharov VV. [The influence of globalisation processes on the breaking of the national cultural code: socio-philosophical analysis]. In: Goncharov VV, editor. *Global'nyi konstitutsionalizm i perspektivy mirovogo razvitiya. Materialy II Mezhdunarodnoi nauchno-prakticheskoi konferentsii (simpoziuma) № MK-2; 11 sentyabrya 2020 g.; Krasnodar, Rossiya* [Global constitutionalism and prospects for world development. Proceedings of the 2nd International scientific and practical conference (symposium) No. MK-2; 2020 September 11; Krasnodar, Russia]. Moscow: Sputnik+; 2021. p. 174–183. Russian.

12. Ratsiburskaya LV, Sharypina TA. Contemporary issues of studying of Western European and Russian mindset (according to the results of Russian nationwide conference «National identity through language and literature. Characteristics of conceptosphere of a national culture»). *Liberal Arts in Russia*. 2015;4(1):22–33. Russian. DOI: 10.15643/libartrus-2015.1.4.

13. Boldyreva TV. *Tipologiya kul'turnykh kodov v dramaturgii L. N. Andreeva* [Typology of cultural codes in the dramaturgy of L. N. Andreev] [dissertation]. Samara: Samarskii gosudarstvennyi pedagogicheskii universitet; 2008. 186 p. Russian.

14. Zhilina MYu. *Metasyuzhet sud'by liricheskogo geroya v poezii S. A. Esenina: osnovnye kul'turno-khudozhestvennye kody i motivnye kompleksy* [The metaplot of the fate of the lyrical hero in the poetry of S. A. Yesenin: main cultural and artistic codes and motive complexes] [dissertation]. Omsk: Dostoevsky Omsk State University; 2006. 211 p. Russian.

15. Kalugina LV. *Poeziya Vladimira Vysotskogo i zapadnoevropeiskaya literatura Srednevekov'ya i Vozrozhdeniya: vzaimodeistvie diskursov i kul'turnykh kodov* [The poetry of Vladimir Vysotsky and Western European literature of the Middle Ages and the Renaissance: interaction of cultural discourses and cultural codes] [dissertation]. Omsk: Dostoevsky Omsk State University; 2014. 153 p. Russian.

16. Kulikov EA. *Natsional'nye i kul'turnye kody v romanakh Dena Simmonsa* [National cultural codes in the novels of Dan Simmons] [dissertation]. Nizhny Novgorod: National Research Lobachevsky State University of Nizhny Novgorod; 2018. 203 p. Russian.

17. Melnikava AM. *Kanceptualizacyja nacyjanalnaga w belaruskaj proze pershaj trjeci XX stagoddzja* [Conceptualisation of the national in Belarusian prose of the first third of the 20th century] [dissertation]. Gomiel: Francisk Skorina Gomiel State University; 2017. 237 p. Belarusian.

18. Romanov AA. *Kul'turnye kody v lirike E. Shvarts* [Cultural codes in E. Schwartz's lyrics] [dissertation]. Saratov: Saratov State University; 2021. 217 p. Russian.

19. Trubetskova EG. *Morbual'nyi kod russkoi literatury XX–XXI vv.* [Morbuya code of Russian literature of 20th–21st centuries] [dissertation]. Saratov: Saratov State University; 2022. 477 p. Russian.

20. Cvirka K. *Vowchaja vyspa* [Wolf island]. Minsk: Harvest; 2019. 640 p. Belarusian.

21. Galubovich LM. From Martin Kukhta to Kastus Cvirka. For the 80th anniversary of poet, writer and publisher. *Dziejaslou*. 2014; 2:302–307. Belarusian.

22. Navaselcava GV. [Kastus Cvirka's novel-essay «Wolf island» in the context of modern Belarusian literature]. In: Adamian TM, editor. *Viciebski kraj. Matjeryjaly VI Mizhnarodnaj navukova-praktychnaj kanferjencyi, prysvechanaj 75-goddzju Peramogi w Vjalikaj Ajchynnaj vajnie; 19 listapada 2020 g.; Viciebsk, Bielarus. Tom 6.* [Vitebsk region. Proceedings of the 6th International scientific and practical conference dedicated to the 75th anniversary of the Victory in the Great Patriotic War; 2020 November 19; Vitebsk, Belarus. Volume 6]. Minsk: National Library of Belarus; 2021. p. 373–377. Belarusian.

23. Liashchynskaja VA. *Gastranamichny kod kultury belarusaw. Stjerjeatypy ezhy w vobrazah frazealagizmaw belaruskaj movy* [Gastronomic code of Belarusian culture. Stereotypes of food in the images of phraseological units of the Belarusian language]. Minsk: Republican Institute for Higher Education; 2022. 271 p. Belarusian.

24. Kolas Ja. *Novaja zjamlja* [New land]. Minsk: Mastackaja litaratura; 2007. 333 p. Belarusian.

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 12.09.2023.*
*Received by editorial board 12.09.2023.*